УДК 821.161.3.09 Пакутны век7Якавенка

# ДУХОЎНЫЯ ІДЭАЛЫ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА Ў ТРЫЛОГІІ ВАСІЛЯ ЯКАВЕНКІ “ПАКУТНЫ ВЕК”

***Таісія Сухоцкая***
*Мінск, Беларусь*

Раскрываецца сэнс духоўных ідэалаў беларускага грамадства ў ХХ стагоддзі (свабоды, справядлівасці, патрыятызму, непрыняцця насілля і іншых), сцвярджаецца інтэнцыя беларускай нацыі захаваць і ўмацаваць духоўныя рэсурсы, неабходныя для будаўніцтва сваёй суверэннай дзяржавы, падкрэсліваецца жыццястойкасць культурных сэнсаў, закладзеных у ідэалах беларускага грамадства.

***Ключавыя словы: ідэал, духоўны ідэал, інтэнцыя, ідэальнае, матэрыяльнае***

Ва ўмовах сацыяльных крызісаў і перыяды трансфармацый грамадства ўзрастае роля ідэалаў як актыўнай арганізуючай сілы ў вырашэнні грамадскіх праблем. Адсутнасць

Полесгу

дзейсных духоўных ідэалаў вядзе да апатыі, абыякавасці і агрэсіі асобы. У беларускай культуралогіі не дастаткова асэнсавана вартасць нацыятворчай і культуратворчай дзейнасці беларусаў у ХХ стст. Адметнасць і арыгінальнасць культуры дадзенага перыяду закадзіравана найперш у яе ідэалах. Іх культурныя сэнсы раскрываюць змест нацыянальнай самасвядомасці, адметнасць вырашэння шматлікіх анталагічных праблем: сэнс зямнога чалавечага існавання, стасункі чалавека з акаляючым асяроддзем, змест і мэту грамадскай і культуратворчай дзейнасці гістарычнага суб’екта.

Паняцце ідэалу ў айчыннай і замежнай гуманітарыстыцы раскрываецца неадназначна. У цэнтры навуковых дыскусій знаходзяцца праблемы сутнасці ідэалу, прынцыпаў яго фарміравання, спосабаў рэалізацыі і г.д. Паняцце ідэалу прысутнічае не толькі ў духоўным, але ў мастацкім і матэрыяльным слаях культуры як цэласнай універсальнай сістэмы. Існуючы аб’ектыўна, ідэалы дзейнічаюць ў практыцы рэальных сацыякультурных адносін і суб’ектыўна перажываюцца, уздзейнічаюць на грамадскае і асабістае жыццё. Таму, на думку русскага даследчыка А.У. Гулыгі, ідэал складана апісваць паняццямі і катэгорыямі, найлепш падыходзіць вобразная форма [1, с. 8].

Культура з’яўляецца практычным увасабленнем ідэалаў пануючай духоўнасці і светапогляду ў грамадскай свядомасці і быцці: маралі, мастацтве, палітыцы, навуцы, адукацыі і г.д. Духоўнасць праз сістэму ідэалаў уплывае на культуру. Іерархічнасць ідэалаў абумоўлена патрэбамі чалавека і грамадства: этычныя, прававыя, эстэтычныя, рэлігійныя і г.д.

З пазіцый культуралагічнага падыходу ідэал вызначаецца найперш як найвышэйшая каштоўнасць, а духоўны ідэал выступае цэнтральным кампанентам, ядром светапогляду асобы, валодае вялікім мабілізуючым патэнцыялам. Менавіта змест ідэалу задае інтэнцыю жыццядзеяння гістарычнага суб’екта, падштурхоўвае на практычную дзейнасць па яго рэалізацыі ў жыцці.

Значнасць ідэалаў ў грамадскім і чалавечым быцці падкрэсліваў выдатны філосаф Ігнат Канчэўскі-Абдзіраловіч. Амаль стагоддзе таму назад ён пісаў: “Нашы часы – часы агульнай заблытанасці, часы паўстання праменных быццам ідэалаў і іх канечнага знікання праз нядоўгі час… Тое, што раней здавалася чыстым і светлым, штодзённа аплятаецца жыццёвым брудам і пылам. Так знікаюць праменныя ідэалы, пакідаючы роспач і безнадзейнасць. У такія часы адзінокая чалавечая душа шукае, пераглядаючы ўсё тое, што здавалася каштоўным, святым і жаданым” [2, с. 3].

Неабходнасць актуалізацыі ідэалу ў сучасным беларускім грамадстве сцвярджаў вядомы філосаф М.І. Крукоўскі ў рабоце «Бляск і трагедыя ідэалу». Ідэальнае даследчык супрацьпастаўляе не рэальнаму, а матэрыяльнаму. Менавіта ў адзінстве з ім і адбываецца рэалізацыя ідэалу [3]. Даследчык вылучае іерархічную сістэму ідэалаў беларускага грамадства. Дамінантай у навуковай канструкцыі выступае ўніверсальная ідэя Бога, у якой канцэнтруюцца законы прыроды, ідэалы і духоўныя каштоўнасці. Яна выступае абсалютным арыецірам ў жыцці чалавека.

Праблема ідэала заўсёды закранался ў беларускай мастацкай літаратуры, якая ў ХХ стагоддзі стала формай мастацкага і філасофскага спасціжэння быцця. У трылогіі Васіля Якавенкі “Пакутны век” (2009 г.) у канцэптах “кабала”, надлом”, “гульня на згубу” скандэнсаваны вялікі вопыт мастацкага даследавання сэнсу беларускай гісторыі ў ХХ стагоддзі. Праз апісанне лёсу сям’і Пісарчукоў з палескага Моталя раскрываюцца эпахальныя падзеі мінулага стагоддзя: даваенны час, 1939 год, Другая сусветная вайна, пасляваенныя падзеі. У полі зроку аўтара знаходзіцца не толькі ўся Беларусь, а таксама

ПолесГУ

Варшава, Прага, Берлін, Нью-Йорк, Масква і Вільня. Галоўныя героі твора – Пятро Раманавіч (Пісарчук), яго сын Барыс, унучка Маня, айцец Георгій, Данік Плюгер і інш.

Духоўныя ідэалы беларускага народа фарміраваліся ў кантэксце каштоўнаснай сітэмы народнай культуры і хрысціянства. ХХ стагоддзе, як паказвае В. Якавенка, прадэманстравала іх супрацьстаянне афіцыйным, ідэалам уладных структур (калектывізацыя, камуністычная ідэалогія і т. п.). Характэрнымі для народнага светапогляду з'яўляюцца каштоўнасці зямлі, вольнай працы на ёй, гарманічныя адносіны паміж прыродай і соцыўмам. Чалавек павінен успрымаць прыроду як храм і сістэма маральных законаў павінна быць распаўсюджана і на яе. В. Якавенка паказвае супрацьстаянне каштоўнасных інтэнцый традыцына-народных і афіцыйных ідэалаў у працэсе нацыятворчасці і здабывання дзяржаўнай самастойнасці.

Кансалідуючым сродкам беларускага грамадства ў творы выступае нацыянальная ідэя, якая сцвярджае і абгрунтоўвае агульныя для ідэалаў сістэмы нормаў і каштоўнасцей. Менавіта яна матэрыялізуе ў сабе самастойнасць і незалежнасць беларускага грамадства. У "Пакутным веку" паказваюцца этапы яе зараджэння, развіцццяя. Нацыянальную беларускую ідэю філосаф М.І. Крукоўскі бачыць увасабленнем духу і самасвядомасці народа, нацыі, здзейсненае ў беларускай суверэннай дзяржаве як рэальнасці, выражанае на роднай беларускай мове і адухоўленае беларускай хрысціянскай царквой [3, с. 14]. У трылогіі "Пакутны век" носьбітамі нацыянальнай ідэі выступаюць прадстаўнікі розных сацыяльных супольнасцей: памешчыкі, інтэлегенцыя, святары, простыя сяляне. Яны стаяць перад выбарам: страціць свае этнічныя карані па ўласным жаданні або жыць клопатамі пра росквіт нацыі. Чалавечнасць герояў трылогіі правяраецца праз іх прыхільнасць да традыцыйных каштоўнасцей.

Праблема ўзнікнення дзяржавы і аспектаў яе функцыянавання была надзвычай актуальнай на ўсіх этапах развіцця чалавечага грамадства. У еўрапейскай думцы каштоўнасны аспект дадзенага феномена абгрунтаваны ў канцэпцыях Ж. Бадэна, Т. Гобса, Д. Лока. Беларускі мысліцель пачатку ХХ стагоддзя Суліма (У. Самойла) даказваў, што "ідэя … стварэння ўласнай дзяржавы … не супярэчыць ні закладзеным у прыродзе чалавека інстынктам, ні маральным законам…" [4, с. 165]. Ідэальнай мэтай адданых беларусаў ў трылогіі "Пакутны век" выступае імкненне да вольнай, незалежнай, непадзельнай Беларусі.

Важнай катэгорыяй у беларускай духоўнай культуры з'ўляецца паняцце свабоды. Ідэя індывідуальнай, суб'ектыўнай свабоды, пачынаючы з эпохі беларускага Адраджэння, у значнай ступені абмяжоўвалася інтарэсамі грамады. В. Якавенка паказвае шлях здабывання свабоды на пакручастых этапах нацыянальнай гісторыі. Свабода ўласная і свабода Бацькаўшчыны для герояў "Пакутнага веку" непадзельныя.

Цэнтральным у творы з'яўляецца вобраз праўды. ХХ стагоддзе паказала не раз фальсіфікацыю гістарычнай і культурнай спадчыны. Жыць па праўдзе – гэта значыць прытрымлівацца прынцыпу чалавечнасці, быць ў згодзе са сваім сумленнем, не адыходзіць ад маральных законаў сваёй супольнасці.

У фарміраванні сістэмы духоўных ідэалаў чалавека вялікая роля належыць вобразу Радзімы. Любоў да Бацькаўшчыны з'яўляецца ў народнай культуры абсалютнай каштоўнасцю. Абавязак бараніць сваю зямлю ад ворагаў для герояў трылогіі "Пакутны век" з'яўляецца свяшчэнным. В. Якавенка паказвае значнасць і неперарыўнасць дадзенай традыцыі ў беларускім грамадстве.

Культ зямнога чалавечага жыцця, замілаванне яго праявамі, каштоўнасць звычайных клопатаў у беларускай культуры перадаюцца праз лексікод "казка жыцця". Паэтызацыя побытавай рэальнасці на фоне трагічнага веку, як паказана ў творы В.



Полесгу

Якавенкі, з'яўляецца адметнасцю народнага светапогляду і скіравана на фарміраванне духоўнага імунітэту нацыі супраць розных мадэрновых праектаў і ў будучым.

Здольнасць селяніна да крэатыўнай працы на зямлі сфарміравала ў беларускай культуры ідэал гаспадара. Гаспадарская парадыгма была гарантам захавання культурнай прасторы. Сімвалам яе ў "Пакутным веку" выступае Пісарчук: "Без гаспадара зямля ператворыцца ў пустку. І хто тады будзе злыдняў карміць?" [5, с. 203]. Маральныя якасці, якія набывае чалавек пад час вядзення гаспадаркі, пераносяцца і на грамадскую сферу: разважлівасць, назіральнасць, працаздольнасць, непрыняцце крайніх праяў індывідуалізму, радыкалізму і г.д. У сучасных умовах гаспадарская інтэнцыя выступае сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і механізмаў духоўнай самарэгуляцыі, пачуцця індывідуальнай годнасці і адказнасці за існуючы парадак рэчаў.

Важным узроўнем у іерархіі духоўных ідэалаў выступаюць сямейныя каштоўнасці, скіраваныя найперш на нараджэнне і выхаванне дзяцей. Сямейныя нормы і ідэалы павінны прысутнічаць ва ўзаемадносінах паміж бацькамі і дзяцьмі. Многія старонкі трылогіі "Пакутны век" прысвечаны стасункам Пісарчука з унучкай: "Толькі дзед Пятро ўносіў ва ўтрапёнае сэрцайка і свядомасць Мані штосьці цэласнае і аб'ёмнае – як не прастору і водар палёў, птушыны галас, надзею на доўгае і сталае жыццё ў вялікім свеце" [5, с. 107]. Неперарыўнасць перадачы духоўнай спадчыны малодшаму пакаленню гарантуе стабільнасць і згоду ў грамадстве.

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства прыярытэтнымі становяцца як матэрыяльныя так і духоўныя каштоўнасці: дзяржаўнасць, нацыянальная мова, традыцыі, звычаі, уласная гісторыя, ідэалы свабоды, праўды, салідарнасці. Беларуская нацыя ў агне пакутнага веку захавала і ўмацавала духоўныя рэсурсы, сцвердзіла шлях да суверэннай дзяржаўнасці праз нацыянальна-культурную форму самасцвярджэння.


1. Гулыга, А.В. Русская идея и ее творцы / А.В. Гулыга. – Москва: ЭКСМО, 2003. – 448 с.
2. Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветапогляду / Прадм. С. Дубаўца. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. –
3. 44 с.
4. Крукоўскі, М.І. Бляск і трагедыя ідэалу / М.І. Крукоўскі. – Мінск, 2010. – 283 с.
5. Сулима. «Сим победиши!..»: Очерк крит. оптимизма // Неман. – 1992. – № 1. – С. 158 –187.
6. Якавенка, В.Ц. Пакутны век: трылогія / Васіль Якавенка; 2-е выд., дапрац. – Мінск: Выд. ГА "БелСаЭС "Чарнобыль", 2009. – 896 с.


Полесгу